С.А.Паўлава, *дацэнт*
Н.У.Клімянкова, *дацэнт*

# УЗАЕМАДЗЕЯННЕ ВЫКЛАДЧЫКА СА СТУДЭНТАМІ Ў ПРАЦЭСЕ САМАСТОЙНАЙ РАБОТЫ
## (псіхолага-педагагічны аспект)

Педагогіка вышэйшай школы ў якасці базавых фактараў эфектыўнага функцыянавання сістэмы адукацыі вылучае:

— жаданні навучэнцаў атрымліваць веды і сацыялізавацца, у тым ліку праз набыццё сучасных прафесійных якасцей;

— прафесійны ўзровень ведаў, навуковую і камунікатыўную кампетэнтнасць выкладчыкаў, якія здзяйсняюць адукацыйны працэс;

— якасць вучэбных планаў і праграм, вучэбных дапаможнікаў, вучэбна-лабараторнага абсталявання і тэхнічных сродкаў навучання.

Стварэнне ў студэнтаў матывацыйнай гатоўнасці да ўспрымання і засваення вучэбных дысцыплін з'яўляецца важнай перадумовай авалодання комплексам ведаў. Самастойная работа студэнтаў паспяхова адбываецца толькі ў тым выпадку, калі яны ўяўляюць прафесійную значнасць інфармацыі, якую павінны засвоіць. Пры гэтым па ступені адкрытасці можна вылучыць:

БИБЛИОТЕКА БГУКИ

— адкрытую, славесна адлюстраваную матывацыю з тлумачэннем агульнакультурнай і прафесійнай значнасці інфармацыі, абранага метаду, сродкаў дасягнення вынікаў і інш.;

— скрытую матывацыю, калі прафесійна-практычная значнасць вывучаемага матэрыялу становіцца відавочнай без усялякіх дадатковых тлумачэнняў, бо студэнтам прапануецца вырашэнне творчай праблемы шляхам самастойнага пошуку.

Вопыт выкладання курса “Public relation “ сведчыць аб тым, што другі шлях павышэння матывацыйнай гатоўнасці навучэнцаў да засваення прадмета, развіцця зацікаўленасці ў ім з'яўляецца асабліва перспектыўным, таму што студэнты могуць далучыцца да тых творчых пошукаў, без якіх цяжка ўявіць бібліятэчную прафесію.

Арганізацыя мэтанакіраванай і выніковай самастойнай вучэбнай дзейнасці студэнтаў патрабуе таксама вывучэння ступені падрыхтаванасці да яе, сістэмы ўяўленняў аб значнасці тых ці іншых відаў самастойнай работы. З гэтай нагоды мы правялі анкетаванне навучэнцаў IV—V курсаў (дзённае аддзяленне, 440-я і 540-я групы). Адносіны студэнтаў да самастойнай вучэбнай дзейнасці вызначаюцца матывамі выбару універсітэта. Сярод вядучых матываў вызначаюцца “імкненне атрымаць вышэйшую адукацыю” — 80%; “падабаецца працаваць з людзьмі” — 23%; “імкненне ўдасканальваць сваё прафесійнае майстэрства” — 10%. Цяжкасці, якія ўзнікаюць у працэсе вучобы, студэнты звязваюць з перагружанасцю вучэбнага плана бібліяграфічнымі дысцыплінамі; няўменнем рацыянальна размяркоўваць свой час; адсутнасцю ўменняў і навыкаў самастойнай работы. Усё гэта сведчыць аб недастатковым разуменні спецыфікі самастойнай вучэбнай дзейнасці і ўласных здольнасцей набываць веды.

Важным паказчыкам адносін студэнта да вучобы з’яўляецца зварот за парадамі да выкладчыка. Па нашых даных, 65%

БИБЛИОТЕКА БГУКИ

апытаных ніколі не звярталіся за парадамі да выкладчыка, у тым ліку па пытаннях самастойнай работы. Але той, хто звяртаецца, задаволены дапамогай.

Роля выкладчыка ў арганізацыі, метадычным забеспячэнні і кантролі за вынікамі самастойнай работы студэнтаў бясспрэчная. Менавіта выкладчык не толькі перадае студэнтам свае веды, стымулюе іх самастойную пазнавальную дзейнасць, кантралюе і ацэньвае яе вынікі, але і аказвае пэўны ўплыў на фарміраванне асобасных і прафесійных якасцей будучага спецыяліста ў працэсе непасрэдных індывідуальных зносін з навучэнцамі.

Самастойная работа студэнта патрабуе пастаянных міжасобасных кантактаў яго з выкладчыкам. Тут праяўляюцца не толькі ўзровень прафесійных ведаў педагога, але ў большай ступені яго асабістыя і камунікатыўныя якасці, уменне зразумець студэнта і быць зразуметым ім. Перад вялікай аўдыторыяй, за кафедрай, падчас выкладання лекцыйнага курса, правядзення семінарскіх заняткаў выкладчык можа “схавацца“ за агульнымі фразамі, спаслацца на недахоп часу, абысці “нязручныя“ пытанні. Але калі ён застаецца са студэнтамі сам-насам у працэсе індывідуальных стасункаў на прадмет выканання самастойнай работы, яскрава высвятляецца ўся яго сутнасць прафесіянала і чалавека.

Камунікатыўная кампетэнтнасць выкладчыка — не менш значны фактар поспеху яго дзейнасці, чым прафесійныя веды. Яна часам нават зніжае вартасць апошніх. Псіхолагі падкрэсліваюць вялікую залежнасць разумення і засваення інфармацыі ад успрымання асобы інфарматара. У школе гэта вызначаецца простай формулай: падабаецца настаўнік — падабаецца прадмет. Нельга лічыць, што пасля паступлення ва універсітэт нешта грунтоўна мяняецца. Таму фарміраванне прывабнасці выкладчыка ў вачах студэнта (атракцыя) з’яўляецца неабходнай перадумовай паспяховасці давядзення

БИБЛИОТЕКА БГУКИ

прафесійнай інфармацыі да навучэнца і паўнацэннага кантролю за яе засваеннем.

Калі звярнуцца да фактараў, якія вызначаюць атракцыю (прывабнасць знешняга выгляду; наяўнасць агульных поглядаў, установак, ацэнак; узаемадапаўняльнасць; дапамога ў дасягненні значнай мэты; дыстанцыя ў зносінах; эмпатыя), можна заўважыць, што адны з іх па сутнасці ўласцівыя самой выкладчыцкай дзейнасці, а над іншымі трэба працаваць.

Да фактараў першага тыпу можна аднесці ўзаемадапаўняльнасць. Выкладчык валодае ведамі, якія неабходна набыць студэнту, а ён, у сваю чаргу, мае "свежы" погляд на праблему, якога часам так не хапае выкладчыку. Не менш важным і ўплывовым фактарам з'яўляецца і дапамога ў дасягненні вызначнай мэты. Дадзены фактар працуе на выкладчыка, калі ён сапраўды імкнецца дапамагчы студэнту ў набыцці ведаў і ўпэўніць у іх неабходнасці. Дыстанцыя ў зносінах таксама існуе несумненна і аб'ектыўна. Задача выкладчыка — разумна яе рэгуляваць. Фактар наяўнасці агульных поглядаў, установак, ацэнак таксама працуе на выкладчыка, але толькі пры дастатковай яго актывізацыі. Тут ад выкладчыка залежаць знаходжанне і падкрэсліванне агульнага паміж ім і студэнтам. Найбольш прадукцыйным можа быць прыналежнасць абодвух да адной прафесіі, а таксама думка аб тым, што яны аднолькава зацікаўлены ў высокай якасці і выніковасці ўзаемадзеяння.

Застаюцца, такім чынам, толькі два фактары, над якімі выкладчык павінен працаваць: знешняя прывабнасць і эмпатыя — эмацыянальны водгук на пачуцці партнёра па зносінах. Апошні з'яўляецца найбольш цяжкім для выкладчыцкага разумення. Не ўсе нават здагадваюцца, што дэманстрацыя ўласнай перавагі — найбольш уплывовы канфліктаген, які адназначна фарміруе негатыўныя адносіны студэнта да выкладчыка. Шмат распаўсюджаных метадаў выкладчыцкага

БИБЛИОТЕКА БГУКИ

ўздзеяння падпадаюць пад рубрыку канфліктаўтваральных: напамін аб памылках, заўвага ў выглядзе абразы, ментарскі тон і інш. Ад выкладчыка патрабуюцца пэўныя намаганні, каб нейтралізаваць псіхалагічную шкоду ад самай звычайнай і распаўсюджанай манеры зносін са студэнтамі.

Узаемадзеянне выкладчыка са студэнтам — гэта не толькі педагагічная, але і сацыяльна-псіхалагічная праблема. Пераход да педагагічных тэхналогій, якія патрабуюць ад навучэнцаў максімальнага раскрыцця творчых магчымасцей, залежыць ад стварэння спрыяльных умоў для асабістай самарэалізацыі, самаактуалізацыі і самаадукацыі студэнта.

Дыялагічная мадэль адукацыйнага працэсу цалкам адпавядае дадзеным задачам. Асобасна арыентаваная педагогіка мае вялікую перавагу над традыцыйна аўтарытарнай. Гэта праяўляецца, напрыклад, пры выкладанні замежных моў, дзе новыя тэхналогіі інтэнсіўнага навучання грунтуюцца на актывізацыі міжасобасных зносін, стварэнні гульнявых камунікатыўных сітуацый. Як паказалі вынікі вывучэння стану выкладання замежных моў на ФБІС, студэнты добра засвойваюць вучэбны матэрыял, калі выкладчык:

— стварае сітуацыі, якія садзейнічаюць узнікненню матывацыі і патрэбы выказвання студэнтаў;

— выносіць на абмеркаванне тэмы і пытанні, што выклікаюць жаданне выказацца;

— уводзіць матэрыялы і заданні, якія садзейнічаюць фарміраванню прафесійных ведаў, навыкаў і ўменняў;

— улічвае розныя ўзроўні моўнай падрыхтоўкі студэнтаў шляхам уводзення розных праблемных тэкстаў.

Не апошнюю ролю адыгрываюць і асобасна-камунікатыўныя якасці выкладчыка, яго адносіны да справы, манера ўзаемадзення са студэнтамі. Характэрна, што канфліктныя сітуацыі паміж выкладчыкамі і студэнтамі часцей за ўсё ўзнікаюць у групах з высокім узроўнем моўнай

БИБЛИОТЕКА БГУКИ

падрыхтоўкі. Студэнты, якія прыходзяць ва універсітэт з лінгвагуманітартанага каледжа з добрым веданнем замежнай мовы, прад'яўляюць свае патрабаванні да выкладання, і гэта не заўсёды выклікае станоўчую рэакцыю з боку педагога. Часам ён імкнецца любымі сродкамі "паставіць на месца" студэнта, які валодае замежнай мовай і дэманструе свае веды. Нам даводзілася выступаць у якасці арбітраў у канфліктах такога кшталту.

Трэба адзначыць, што кафедра замежных моў усё ж прыйшла да неабходнасці не толькі прафіляваць свой курс з улікам спецыялізацыі студэнтаў, але і прыстасоўваць методыку выкладання да асаблівасцей узаемадзеяння са студэнтамі, якія ўжо добра ведаюць мову, маюць вопыт непасрэдных зносін з яе носьбітамі і могуць "на роўных" размаўляць з педагогам.

Выкладанне ў такіх групах адбываецца больш паспяхова, чым больш увагі надаецца самастойнай рабоце студэнта па перакладзе неадаптаваных іншамоўных тэкстаў па спецыяльнасці. Студэнты і выкладчыкі выступаюць тут у ролі суразмоўцаў, супрацоўнікаў, калег. Прычым студэнт як будучы бібліятэкар лепш уяўляе спецыфіку прафесійнай лексікі, а выкладчык як мовазнаўца дапамагае яму ў пераадоленні моўных бар'ераў.

Супрацоўніцтва студэнта з выкладчыкам як форма арганізацыі самастойнай работы і кантролю за яе выкананнем адбываецца не толькі падчас выкладання замежных моў. У бібліятэказнаўчых курсах, якія патрабуюць самастойнай падрыхтоўкі мерапрыемстваў, выканання работ, мадэліруючых рэальныя вытворчыя сітуацыі, выкладчык і студэнты разам працуюць над выбарам тэмы, адборам матэрыялаў і сродкаў дасягнення пастаўленай мэты. Прычым асноўная нагрузка выконваецца студэнтамі, а кіраўніцтва і ацэнка вынікаў — выкладчыкамі.

БИБЛИОТЕКА БГУКИ

Прыкладам творчага ўзаемадзеяння выкладчыка са студэнтам можа быць выкананне практычнага задання па вывучэнні запытаў чытачоў у бібліятэцы (курс "Абслугоўванне чытачоў"). Студэнты павінны самастойна падрыхтаваць праграму, інструментарый сацыялагічнага даследавання, правесці апытанне і зрабіць вывады. Вядома, што ажыццявіць усё гэта на дастатковым узроўні без дапамогі выкладчыка вельмі цяжка. Падчас лабараторных занятках, у пазааўдыторны час выкладчык кансультуе, накіроўвае кожнага студэнта, дапамагае выправіць памылкі, перадае своей вопыт правядзення сацыялагічнага даследавання. Прафесіяналізм кожнага чалавека найбольш поўна праяўляецца ў веданні дэталей, сакрэтаў майстэрства. Прадэманстраваць гэта выкладчык можа лепш за ўсё ў працэсе індывідуальных заняткаў, дапамагаючы выконваць самастойнае заданне. У студэнта складваецца ўражанне аб прафесійнай годнасці педагога на падставе таго, як ён адказвае на канкрэтнае практычнае пытанне ў межах сваёй кампетэнцыі.

Найбольш грунтоўныя і ўсебаковыя кантакты паміж выкладчыкам і студэнтам адбываюцца падчас падрыхтоўкі курсавых і дыпломных работ. Гэта прыклад творчага супрацоўніцтва ў вывучэнні пэўнай тэмы. Не выпадкова выкладчык разглядае часам адзнаку за студэнцкі дыплом як вызначэнне ўласнай прафесійнай годнасці. Узаемадзеянне студэнта з выкладчыкам у працэсе выканання дыпломнай работы па сваёй складанасці і інфармацыйнай напаўняльнасці можа быць прадметам самастойнага даследавання.

Такім чынам, камунікатыўная кампетэнтнасць педагога, яго ўменне зразумець студэнта, знайсці да яго падыход, перадаць свой вопыт і свае веды — не менш важны бок дзейнасці, чым спецыяльныя веды. На жаль, фарміраванне камунікатыўных якасцей выкладчыка адбываецца стыхійна, метадам спроб і памылак, якія часам дорага каштуюць і яму самому, і студэнту.

БИБЛИОТЕКА БГУКИ

Сучаснаму універсітэту неабходна ствараць сістэму псіхалагічнай дыягностыкі і псіхалагічнай падрыхтоўкі выкладчыка да стасункаў са студэнтамі. Неад'емнай часткай такой сістэмы павінна стаць псіхалагічная служба, якая здолее аказаць кваліфікаваную дапамогу і студэнтам, і выкладчыкам у пераадоленні псіхалагічных бар'ераў, ліквідацыі канфліктных сітуацый і цяжкасцей ва ўзаемадзеянні.

БИБЛИОТЕКА БГУКИ

здольнасці і патрэбнасць пастаяннага папаўнення атрыманых ведаў, іх мадэрнізацыі ў сувязі з новымі кірункамі ў развіцці грамадства. Вызначальнай структурнай адзінкай такога фарміравання спецыяліста становіцца актывізацыя яго самастойнага мыслення, крэатыўнага ўспрымання рэчаіснасці, рэфлексіўных адносін да асабістай дзейнасці, што адлюстроўвае ролю адукацыі ў развіцці грамадства.

Такім чынам, сучасныя патрабаванні да педагагічнай дзейнасці прадугледжваюць наяўнасць высокага ўзроўню прафесійнага майстэрства і педагагічнай культуры настаўніка, якія фарміруюцца ў працэсе мэтанакіраванай самастойнай работы студэнта ў час навучання ва універсітэце.

Сістэмны падыход да аналізу педагагічнай культуры дазваляе вылучыць найбольш значныя яе якасці:

— шырокі навуковы светапогляд;

— глыбокія псіхолага-педагагічныя веды і ўменні;

— высокі ўзровень прафесійных ведаў (па прадмеце выкладання);

— кіраўніцкія здольнасці.

Відавочна, што набыццё ўказаных якасцей можа быць дасягнута толькі ў працэсе актыўнай самастойнай дзейнасці асобы, таму што ў гэтай дзейнасці забяспечваецца найбольш поўны ўлік індывідуальных асаблівасцей студэнта, ажыццяўляецца стымуляванне яго пазнавальнага інтарэсу, фарміруецца патрэбнасць самастойнага мыслення, творчага падыходу да вырашэння праблем.

У педагагічнай навуцы ўсталявалася сістэма ўзроўняў самастойнай работы студэнтаў па ступені іх складанасці:

— узнаўленне па ўзоры;

— рэканструкцыйна-пераўтваральныя ўменні;

— частковa-пошукавыя работы;

БИБЛИОТЕКА БГПУ